**Праект па арганізацыі шостага школьнага дня "На скрыжалях аграгарадкоў" рэалізоўваецца ў Ваўкавыскім раёне з верасня мінулага года. У ім аб'яднаны школьнікі Ваўкавыска і сельскіх устаноў адукацыі.**




# Агратурысты рушаць у паход

Калі ў некалькіх словах выказаць змест праекта, то гэта знаёмства дзяцей з іншымі навучальнымі ўстановамі і мясцовасцямі, дзе яны знаходзяцца. Але гэта не проста экскурсіі, ім папярэднічае вялікая пазнавальная работа.

— Сёння адной з актуальных `задач, якія стаяць перад педагагічнымі калектывамі ўстаноў сістэмы адукацыі, з'яўляецца арганізацыя работы ў шосты школьны дзень. Разам з тым 2018—2020 гады праходзяць пад знакам Года малой радзімы. У сувязі з гэтым неабходна працягваць работу, накіраваную на фарміраванне ў вучняў любові да малой радзімы, цікавасці і павагі да яе гісторыі і культуры, адказных адносін да сучаснасці і будучыні роднага краю, — гаворыць адна з распрацоўшчыкаў праекта загадчык сектара выхаваўчай і сацыяльнай работы ўпраўлення адукацыі Ваўкавыскага райвыканкама Святлана Іванаўна Стачук.

Каардынатарамі праекта з'яўляюцца ўпраўленне адукацыі Ваўкавыскага райвыканкама, Краснасельскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, Ваўкавыскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі. Суаўтарамі праекта з'яўляюцца таксама дырэктар Краснасельскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Святлана Аляксандраўна Канавалава і метадыст цэнтра Таццяна Паўлаўна Самардак, педагог-арганізатар Ваўкавыскага раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Наталля Іванаўна Сяргей.

Адна з устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Ваўкавыска ў трэцюю суботу месяца становіцца галоўным аграскрыжаваннем. Сюды прыязджаюць навучэнцы з некалькіх аграгарадкоў. У чацвёртую суботу ваўкавыскія школьнікі адпраўляюцца ў агратур у навучальныя ўстановы аграгарадкоў раёна.

Што ж адбываецца на аграскрыжаваннях? Праект складаецца з некалькіх модуляў. Модуль "АграСкрыжаванне" праходзіць у навучальных установах Ваўкавыска ў выглядзе гульняў, тэст-віктарын, квестаў, якія арганізоўваюць сельскія навучэнцы.

У верасні мінулага года першай пачынала ўдзел у праекце гімназія № 1 Ваўкавыска. Навучэнцы 6—9-х класаў пазнаёміліся з гісторыяй стварэння аграгарадкоў Вярэйкі, Рось, Мацвеёўцы, Юбілейны, Падароск, даведаліся пра знакамітых людзей, што тут жывуць, пра традыцыі і абрады. На кожным аграскрыжаванні навучэнцы адказвалі на пытанні тэст-віктарыны і атрымлівалі балы. У наступную суботу пераможцы — зборная каманда 9-х класаў — адправіліся на экскурсію ў аграгардок Вярэйкі.

У розных напрамках ад "АграСкрыжавання" разыходзяцца «АграЗавулкі» — у дзесяць населеных пунктаў раёна: Рось, Вярэйкі, Юбілейны, Волпа, Субачы, Гнезна, Падароск, Шылавічы, Рэпля, Мацвеёўцы, куды на працягу навучальнага года адпраўляюцца навучэнцы з Ваўкавыска. Кожную чацвёртую суботу месяца група агратурыстаў, якая набрала больш за ўсё балаў па выніках тэсціравання, адпраўляецца ў агратур, які ўключае экскурсійна-забаўляльную праграму з выкарыстаннем мясцовых народных абрадаў, майстар-клас народных умельцаў аграгарадка, дэгустацыю фірменных страў мясцовасці. На кожным "АграЗавулку" арганізавана работа творчых падворкаў, дзе ў выглядзе займальнага, цікавага і пазнавальнага мерапрыемства прэзентуецца малая радзіма — аграгарадок. Работа творчых падворкаў уключае відэасалон "Экскурс-ТБ", гульнявую майстэрню "АграГульнятэка", музей у чамадане "МузЭкспанат".

— Па выніках такіх падарожжаў дзеці атрымліваюць вопыт сацыяльнага ўзаемадзеяння, знаёмяцца з новымі людзьмі і новымі фактамі з гісторыі роднага краю, — гаворыць дырэктар Ваўкавыскага раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Іна Вацлаваўна Кулак. — Яны ствараюць матэрыялы па арганізацыі шостага школьнага дня, распаўсюджваюць іх сярод аднавяскоўцаў. Гэта матэрыялы відэафонду "Ля вытокаў малой радзімы", дайджэст "Абрадавая энцыклапедыя", афлайн-часопіс "Майстры-ўмельцы аграгарадка". А калі браць лічбы, то ўжо каля тысячы навучэнцаў прынялі ўдзел у праекце "На скрыжалях аграгарадкоў".

Завяршыць праект плануецца ў маі — чэрвені модулем "СуперТур", які арганізоўваюць у форме аграфестывалю "Агра-ФЭСТ". Арганізатары абвесцяць лепшых сярод "АграЗавулкаў" у намінацыях "Лепшы відэасалон", "Лепшая гульнявая майстэрня" і "Лепшы музей у чамадане". Пераможцы анлайн-віктарыны і пераможцы кожнай намінацыі выйграюць "СуперТур" (яго план арганізатары праекта трымаюць у сакрэце, каб гэта стала для пераможцаў сапраўдным сюрпрызам, запэўніваюць толькі, што падарожжа будзе цікавым). А падчас работы камунікатыўнай пляцоўкі "Вашы прапановы на будучыню праекта" дзеці выкажуць сваё бачанне арганізацыі шостага дня.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
grodna@nastgaz.by